**Установа адукацыі
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»**

**УДК [069 : 82] : 008(476)**

**Лупашка
Ірына Генадзьеўна**

# ФУНКЦЫЯНАВАННЕ БЕЛАРУСКІХ ЛІТАРАТУРНЫХ МУЗЕЯЎ У КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНЫХ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫХ ПРАЦЭСАЎ

Аўтарэферат дысертацыі
на саісканне вучонай ступені кандыдата культуралогіі

па спецыяльнасці 24.00.03 – музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб’ектаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2013

Работа выканана на кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Навуковы кіраўнік: **Бяспалая Марыя Аркадзьеўна,** доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Афіцыйныя апаненты: **Гарбацкі Андрэй Аляксандравіч,** доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі славянскіх народаў УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

**Джумантаева Тамара Аляксандраўна,** кандыдат культуралогіі, дырэктар навукова-даследчай і асветніцкай установы культуры «Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музейзапаведнік»

Апаніруючая арганізацыя: УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»

Абарона адбудзецца 30 мая 2013 г. а 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 пры УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі; e-mail: buk@buk.by; тэл. вучонага сакратара 222-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

Аўтарэферат разасланы 24 красавіка 2013 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат мастацтвазнаўства,
дацэнт В.У. Мазанік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

Музеі як неад'емная частка сацыякультурнай структуры грамадства ў сучасных умовах перажываюць сур'ёзныя трансфармацыі. Сацыякультурная сітуацыя, якая склалася ў сучасным беларускім грамадстве, характарызуецца складанымі працэсамі ўзаемадзеяння экзагенных і эндагенных фактараў. Да знешніх (экзагенных) фактараў адносяцца, перш за ўсё, працэсы глабалізацыі, якія непазбежна ўплываюць і на беларускія сацыякультурныя рэаліі. Інтэграцыя, урбанізацыя, міграцыя, інфарматызацыя грамадства і іншыя сусветныя працэсы маюць супярэчлівы характар: з аднаго боку, яны спрыяюць інтэграцыі культур, з другога – садзейнічаюць зніжэнню ролі і значнасці традыцыйных сацыякультурных каштоўнасцей. Працэсы глабалізацыі суправаджае і такая з'ява, як шырокае распаўсюджанне масавай культуры, асноўнымі характарыстыкамі якой з'яўляюцца ўніфікаванасць і шаблоннасць.

Дамінуючае значэнне для характарыстыкі сучаснай сацыякультурнай сітуацыі ў Беларусі маюць фактары ўнутранага развіцця (эндагенныя): securityэканамічная і палітычная мадэлі, сацыяльная дынаміка, змена дзяржаўнага ладу, уплыў Чарнобыльскай катастрофы і інш. Разбурэнне савецкага тыпу культуры, змяненне ідэалогіі і нацыянальнай ідэі і да т.п – усё гэта ўплывае на змену каштоўнасных ідэалаў асобы. Значнымі фактарамі, якія ўздзейнічаюць на сацыякультурную ідэнтычнасць беларусаў, з'яўляюцца рэлігійны плюралізм і дзяржаўнае двухмоўе.

Сацыяльная дэтэрмінаванасць дзейнасці сучаснага музея, яго поліфункцыянальнасць, адкрытасць запатрабаванням аўдыторыі, пашырэнне тэматычных межаў абумоўліваюць актуальнасць музея як адкрытай сістэмы з гнуткай і мабільнай структурай. У сістэме музеяў Міністэрства культуры Беларусі належнае месца займаюць літаратурныя музеі, якія збіраюць, вывучаюць і прэзентуюць літаратурную спадчыну як важную частку гісторыі і культуры краіны. У сувязі з гэтым даследаванне функцыянавання беларускіх літаратурных музеяў у сучасных сацыякультурных рэаліях уяўляецца актуальным.

Літаратурныя музеі Беларусі абраны намі ў якасці аб'екта даследавання як найменш вывучаная профільная група ў айчынным музеязнаўстве. Яна прадстаўлена 7 музеямі і 11 філіяламі. Акцэнт зроблены на вывучэнне галаўных музеяў, бо менавіта імі рэгламентуецца дзейнасць філіялаў. Тэрытарыяльна пераважная большасць галаўных музеяў знаходзіцца ў сталіцы (5 музеяў), філіялы ў асноўным размяшчаюцца ў сельскай мясцовасці, што вызначае спецыфіку іх дзейнасці. У дысертацыі не разглядаюцца літаратурныя аддзелы краязнаўчых музеяў, літаратурныя музеі навучальных устаноў, прыватныя, а таксама музеі, створаныя грамадскімі арганізацыямі.

Літаратурныя музеі – група музеяў, якая актыўна развіваецца і мае значны патэнцыял, таму што ў сучасных сацыякультурных умовах узрастае іх роля як захавальнікаў гісторыка-культурнай (а канкрэтна – літаратурнай) спадчыны. Кожная нацыянальная культура грунтуецца на самабытных дасягненнях, цікавых як для суайчыннікаў, так і для іншых народаў. Ёсць такія прыклады і ў беларускай літаратуры,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

многія творы якой сусветна вядомыя. Літаратура і музей выконваюць у грамадстве функцыю мадэлявання гісторыка-культурнага працэсу. Разам з тым музей з'яўляецца адной з устаноў культуры, якая мае магчымасць трансляцыі культурных каштоўнасцей і прымае актыўны ўдзел у фарміраванні духоўнай культуры чалавека і грамадства.

Вывучэнне гісторыі станаўлення беларускіх літаратурных музеяў, выяўленне іх спецыфікі, абагульненне вопыту работы і ацэнка сённяшняга стану дазваляюць вызначыць перспектывы развіцця і павышэння эфектыўнасці іх дзейнасці ў сучасных умовах.

Храналагічныя рамкі праведзенага даследавання ахопліваюць перыяд з 1920-х гг. да сённяшняга часу. Выбар ніжняй храналагічнай мяжы абумоўлены тым, што менавіта ў 1920-я гг. зроблены першыя спробы арганізацыі літаратурных музеяў на тэрыторыі Беларусі.

Дзейнасць літаратурных музеяў вывучалася па наступных напрамках: рэалізацыя сацыяльных функцый праз навукова-фондавую, экспазіцыйна-выставачную, культурна-адукацыйную работу; адпаведнасць развіцця беларускіх музеяў сусветным тэндэнцыям. На падставе аналізу азначаных кірункаў вызначаюцца тэндэнцыі і перспектывы далейшага развіцця музеяў літаратурнага профілю.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі**

Дысертацыя з'яўляецца часткай навукова-даследчай праблематыкі кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па тэмах «Гісторыка-культурная спадчына: праблемы захавання» (№ ДР 2007212, зацв. на Савеце ўніверсітэта 21.03.2006 г., пратакол № 7) і «Гісторыка-культурная спадчына Беларусі: вывучэнне, захаванне, трансляцыя» (№ ДР 20115713, зацв. на Савеце ўніверсітэта 21.12.2010 г., пратакол № 4).

**Мэта і задачы даследавання**

**Мэта даследавання** – выяўленне асноўных заканамернасцей, спецыфікі і тэндэнцый развіцця літаратурных музеяў Беларусі пад уздзеяннем адпаведных сацыякультурных умоў.

Азначаная мэта абумовіла рашэнне наступных **задач**:

– прасачыць дынаміку станаўлення і развіцця сеткі літаратурных музеяў Беларусі;

– вызначыць асаблівасці літаратурнага музея як сацыякультурнага інстытута, распрацаваць аўтарскае вызначэнне і даць класіфікацыю літаратурных музеяў;

– раскрыць поліфункцыянальнасць літаратурных музеяў у кантэксце сучасных сацыякультурных працэсаў;

– адлюстраваць спецыфіку інтэрпрэтацыі і прэзентацыі літаратурнай спадчыны як часткі гісторыка-культурнай спадчыны ў літаратурным музеі;

– выявіць тэндэнцыі і перспектывы развіцця літаратурных музеяў Беларусі.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

**Аб'ект** даследавання – літаратурныя музеі Рэспублікі Беларусь і іх філіялы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Прадмет** даследавання – эвалюцыя зместу дзейнасці літаратурных музеяў Беларусі пад уплывам сацыякультурных працэсаў.

Выбар аб’екта і прадмета даследавання абумоўлены адсутнасцю работ па дадзенай праблематыцы ў айчынным музеязнаўстве, а таксама неабходнасцю далейшага вывучэння беларускіх літаратурных музеяў у культуралагічным кантэксце.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. У працэсе станаўлення і развіцця сеткі літаратурных музеяў Беларусі можна вылучыць чатыры этапы: 1920-я – пачатак 1940-х гг. (дзейнічае два музеі, адзін з якіх напрыканцы этапу рэарганізаваны), 1940-я – 1980-я гг. (4 музеі і 5 філіялаў), канец 1980-х – 2001 г. (7 музеяў і 12 філіялаў), 2002 г. – па цяперашні час (7 музеяў і 11 філіялаў), што дазваляе вызначыць характэрныя рысы кожнага этапу ў фарміраванні сеткі літаратурных музеяў і адлюстраваць яе колькасную дынаміку. Першыя літаратурныя музеі створаны ў 1920-я гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі па ініцыятыве мясцовага насельніцтва і пры актыўным удзеле навуковага таварыства «Міцкевічаўскі камітэт». Далейшае фарміраванне сеткі літаратурных музеяў адбываецца пераважна з удзелам дзяржаўных органаў шляхам мемарыялізацыі жыцця і дзейнасці вядомых беларускіх літаратараў. На працягу азначанага перыяду склалася сетка музеяў, якая ўключае адзін музей нацыянальнай літаратуры і шэраг музеяў, прысвечаных творчасці асобных літаратурных дзеячаў. Арганізацыйна-структурнай адметнасцю літаратурных музеяў з’яўляецца стварэнне разгалінаванай сеткі рэгіянальных філіялаў, што адпавядае сучаснай тэндэнцыі пашырэння музейнай прасторы.

2. Літаратурныя музеі агульнамузейнымі сродкамі праз музеефікацыю літаратурных, гісторыка-культурных працэсаў і з’яў адлюстроўваюць палітыка-эканамічныя, сацыяльна-культурныя ўмовы існавання грамадства. Як сацыякультурныя інстытуты літаратурныя музеі маюць спецыфіку, якая вызначаецца аб’ектам музеефікацыі і праяўляецца ў дакументаванні і прэзентацыі творчасці таго ці іншага літаратара або літаратурнага працэсу наогул у непарыўнай сувязі з сацыякультурнымі каштоўнасцямі пэўнага гістарычнага перыяду, што дазваляе распрацаваць аўтарскае вызначэнне літаратурных музеяў як профільнай групы музеяў, якая дакументуе гісторыю літаратуры і з гэтай мэтай збірае, вывучае, захоўвае, экспануе і папулярызуе літаратурную спадчыну як частку гісторыка-культурнай спадчыны.

3. Дынаміка развіцця і дзейнасць літаратурных музеяў дазваляе вызначыць іх поліфункцыянальны характар і вылучыць два ўзроўні ў рэалізацыі сацыяльных функцый. Традыцыйныя функцыі, такія як дакументаванне, адукацыйна-выхаваўчая, аксіялагічная, інтэрпрэтацыйная, камунікатыўная, рэкрэацыйная, адлюстроўваюць асноўныя кірункі дзейнасці літаратурнага музея і складаюць першы ўзровень. Грамадскае прызначэнне музея і адпаведныя функцыі, да якіх адносяцца ўдзел у працэсе непарыўнага развіцця культуры, забеспячэнне бесперапыннасці трансляцыі культурных традыцый, пераўтварэнне музея ў месца міжкультурнага ўзаемадзеяння – гэта другі ўзровень. У залежнасці ад сацыякультурных умоў прыярытэты ў дзейнасці літаратурных музеяў мяняюцца, што пацвярджаецца эвалюцыяй яе форм і метадаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Асноўнымі формамі прэзентацыі літаратурнай і гісторыка-культурнай спадчыны ў літаратурным музеі з'яўляюцца стацыянарныя экспазіцыі і часовыя выставы. Арганізацыя апошніх мае спецыфіку, таму што фондавыя і справаздачныя выставы складаюць невялікі працэнт. Адметнасцю літаратурных музеяў у экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці можна лічыць стварэнне юбілейных выстаў, якія прысвячаюцца знамянальнай даце ў творчасці пісьменніка ці літаратурнай падзеі. Асноўная колькасць літаратурных экспазіцый і выстаў ствараецца на падставе тэматыка-храналагічнага, ансамблевага, а таксама комплекснага метадаў. Амаль не выкарыстоўваецца літаратурнымі музеямі сістэматычны (калекцыйны) метад пабудовы экспазіцый з прычыны спецыфікі экспазіцыйнага матэрыялу, які мае пераважна плоскасны характар.

5. Асноўнымі тэндэнцыямі ў дзейнасці літаратурных музеяў на сучасным этапе развіцця з'яўляюцца змены ў розных напрамках музейнай работы (культурна-адукацыйным, экспазіцыйна-выставачным, навукова-фондавым), якія абумоўлены сацыякультурнымі запатрабаваннямі. Інавацыйныя формы і метады працы рэалізуюцца на аснове традыцыйна ўласцівых музею функцый. Найбольш перспектыўным падаецца пашырэнне і паглыбленне зместу камунікатыўнай функцыі літаратурнага музея (пошукі новых форм і метадаў працы з аўдыторыяй, паступовы пераход да інавацыйных метадаў у экспазіцыйнай рабоце, наданне ўвагі сацыялагічнаму і псіхалагічнаму забеспячэнню музейнай дзейнасці і інш.).

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыйнае даследаванне з'уляецца вынікам асабістых навуковых і практычных пошукаў аўтара і грунтуецца на навуковым аналізе музеязнаўчых, культуралагічных і гістарычных крыніц па тэме. На падставе абагульнення вопыту развіцця беларускіх літаратурных музеяў у кантэксце сацыякультурных працэсаў аўтарам:

– вылучаны і ахарактарызаваны асноўныя этапы фарміравання сеткі літаратурных музеяў і паказана колькасная дынаміка гэтага працэсу;

– адлюстравана поліфункцыянальная дзейнасць беларускіх літаратурных музеяў, іх роля як сацыякультурных інстытутаў;

– вызначана спецыфіка інтэрпрэтацыі і прэзентацыі літаратурнай (як часткі гісторыка-культурнай) спадчыны ў літаратурным музеі;

– прапанавана аўтарскае вызначэнне літаратурнага музея і класіфікацыя літаратурных музеяў;

– вылучаны тэндэнцыі і перспектывы развіцця літаратурных музеяў Беларусі.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання дакладаліся на 9 канферэнцыях (пяць з іх – міжнародныя): VIII Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях, прысвечаных Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 23–26 мая 2002 г.), Трэціх Міжнародных кнігазнаўчых чытаннях «Кніга Беларусі: повязь часоў» (Мінск, 16–17 верасня 2003 г.), Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Бібліятэкі і музеі ў адзінай прасторы інфармацыі і культуры» (Мінск, 4–8 кастрычніка 2004 г.), XXIX канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры «Нацыянальная спадчына і сучасныя праблемы культуры» (Мінск, 22–23 красавіка 2004 г.), XXX канферэнцыі студэнтаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аспірантаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў «Каштоўнасці нацыянальнай культуры і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне студэнцкай моладзі» (Мінск, 20–21 красавіка 2005 г.), XIII Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях, прысвечаных Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24–26 мая 2007 г.), Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Культура Беларусі і сусвет: агульнае і асаблівае» (Мінск, 13–14 лістапада 2008 г.), IV Тышкевіцкіх чытаннях (Валожын, 24 кастрычніка 2012 г.), навукова-практычнай канферэнцыі «Музеі і патрыятычнае выхаванне» (Мінск, 28 лістапада 2012 г.).

**Апублікаванасць вынікаў даследавання**

Вынікі даследавання адлюстраваны ў 11 публікацыях аўтара, чатыры з якіх надрукаваны ў навуковых рэцэнзуемых часопісах (1,4 аўт. арк.), пяць – у матэрыялах навуковых канферэнцый, два – дэпаніраваны. Агульны аб'ём апублікаваных па тэме дысертацыі работ складае 3,5 аўтарскіх аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, асноўнай часткі, прадстаўленай 2 раздзеламі, заключэння, бібліяграфічнага спіса і дадаткаў. Агульны аб'ём дысертацыі складае 163 старонкі, з іх 113 старонак – асноўны тэкст, 32 – спіс выкарыстаных крыніц (399 найменняў на рускай і беларускай мовах) і публікацый аўтара (11 публікацый на беларускай мове), 18 старонак – дадаткі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**Ва ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** даецца абгрунтаванне выбару тэмы даследавання, яе актуальнасці і навуковай навізны, вызначаюцца мэты, задачы, прадмет і аб'ект даследавання, сувязь работы з навуковымі праграмамі, фармулююцца асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, адлюстроўваюцца асабісты ўклад саіскальніка, апрабацыя вынікаў даследавання, колькасць апублікаваных работ, структура і аб'ём дысертацыі.

У першым раздзеле **«Тэарэтычныя асновы развіцця беларускіх літаратурных музеяў як сацыякультурных інстытутаў»** разглядаюцца тэарэтычныя распрацоўкі айчынных і замежных даследчыкаў па праблеме развіцця музея як сацыякультурнага інстытута.

У параграфе **1.1 «Аналітычны агляд літаратуры па тэме і метадалогія даследавання»** аналізуецца ўзровень распрацаванасці тэмы, характарызуецца сучасны стан вывучэння праблемы, вызначаецца метадалогія даследавання.

Навуковую літаратуру, якая выкарыстоўвалася пры вывучэнні тэмы, умоўна можна падзяліць на наступныя групы: работы, якія разглядаюць музей як сацыякультурны інстытут; агульная літаратура па гісторыі і тэорыі музейнай справы; літаратура, прысвечаная тэарэтычнай і практычнай дзейнасці літаратурных музеяў; літаратура, якая асвятляе станаўленне і развіццё беларускіх літаратурных музеяў.

Даследаванне музеязнаўчых праблем адбываецца ў шырокім сацыякультурным кантэксце, таму лагічнай з'яўляецца сувязь музеязнаўства з культуралогіяй. Да разгляду



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пытанняў развіцця музея ў кантэксце сацыякультурных працэсаў звяртаюцца як музеязнаўцы, так і культуролагі. Сярод іх замежныя і айчынныя даследчыкі: З. Бонамі, І. Бястужаў-Лада, М. Каган, Т. Калугіна, А. Масцяніца, В. Сапанжа, А. Смолік, Л. Шляхціна і інш.

Сацыякультурныя функцыі музея разглядаюць ў сваіх даследаваннях А. Ванслава, М. Гнядоўскі, Ю. Гуральнік, У. Дукельскі, А. Закс, Ю. Пішчулін, Д. Равіковіч, А. Разгон, В. Сапанжа, М. Фёдараў і інш. Некаторыя даследчыкі засяроджваюць увагу на асобных аспектах: пытанні навукова-даследчай і навукова-фондавай дзейнасці музеяў закранаюць Ф. Кротаў, М. Кучарэнка, К. Лявыкін, А. Максімаў, Ю. Палякоў, В. Селіванаў, Н. Фінягіна, Д. Цвярская і інш.; да пытанняў навукова-экспазіцыйнай дзейнасці музеяў розных профіляў звяртаюцца А. Закс, А. Міхайлоўская, Т. Палякоў, Я. Розенблюм і інш.; асобныя кірункі культурна-адукацыйнай дзейнасці музея адлюстраваны ў працах Д. Озеравай, Ю. Пішчуліна, Л. Шляхцінай, М. Юхневіч і інш. Узаемаадносіны музея і грамадства на сучасным этапе разглядаюць В. Бяззубава, А. Дземшына, А. Масцяніца, Д. Озерава, А. Сундзіева, Л. Шляхціна, Л. Яшына і інш.

Пачатак паглыбленага вывучэння музеяў літаратурнага профілю, спецыфікі іх дзейнасці адносіцца да другой паловы 1950-х гг. У цэнтры ўвагі даследчыкаў знаходзяцца пытанні экспазіцыйнай, асветніцкай, фондавай працы ў дзейнасці літаратурных музеяў. Звяртаюцца да распрацоўкі праблем літаратурнага музеязнаўства В. Бартэль, З. Бонамі, А. Ванслава, М. Ковач, А. Крэйн, К. Лампеліус, А. Ламунова, М. Лашчынін, Л. Меднэ, Ю. Пішчулін і інш.

Дзейнасць беларускіх літаратурных музеяў не атрымала комплекснага адлюстравання ў даследаваннях савецкіх і беларускіх аўтараў. Тым не менш асобныя гістарычныя факты і звесткі можна знайсці ў працах К. Біруковіч, А. Гужалоўскага, Ю. Жукава, А. Калбаскі, М. Клепікава, С. Марцэлева і інш. Такім чынам, спецыяльных абагульняючых работ, якія вывучаюць станаўленне і развіццё літаратурных музеяў Беларусі ў кантэксце сацыякультурных працэсаў, аналізуюць вопыт іх дзейнасці не існуе. Гэта абумоўлівае выбар тэмы дадзенага даследавання, яго мэт і задач.

Крыніцазнаўчая база даследавання заснавана на выкарыстанні апублікаваных і неапублікаваных матэрыялаў. Першую групу крыніц складаюць заканадаўчыя і іншыя нарматыўна-прававыя акты, якія характарызуюць працэс стварэння і функцыянавання музеяў, рэгламентуюць работу музеяў, іх узаемаадносіны з уладамі, грамадствам і г.д. Наступную групу крыніц складае справаводная (арганізацыйная, планавая, справаздачная) дакументацыя, якая дазваляе прасачыць працу літаратурных музеяў па асноўных кірунках дзейнасці ў розныя перыяды.

Вялікім інфармацыйным патэнцыялам па разглядаемай тэме валодаюць спецыфічна музейныя віды крыніц, якімі з'яўляюцца навуковыя канцэпцыі выстаў і тэматыка-экспазіцыйныя планы, інвентарныя кнігі, каталогі музейных калекцый, даведнікі і буклеты, кнігі водгукаў. У дысертацыі гэтыя матэрыялы выкарыстоўваюцца ў якасці крыніц, якія адлюстроўваюць асобныя кірункі музейнай дзейнасці. Значную групу складаюць статыстычныя матэрыялы, якія дазваляюць прасачыць дынаміку музейнага развіцця, прааналізаваць практычную дзейнасць музеяў. Выкарыстоўваюцца як



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неапублікаваныя дадзеныя з архіваў музеяў, так і апублікаваныя ў штогадовых зборніках Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь і гадавых аглядах Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Метадалагічная база даследавання грунтуецца на культуралагічным падыходзе да феномена музея, што дазваляе вызначыць ролю музеяў у сацыякультурным жыцці грамадства, а таксама прааналізаваць і выкарыстаць канцэптуальныя палажэнні тэорый музейнай камунікацыі, навуковага дакументавання, тэзаўравання, пабудовы экспазіцый і інш. Перспектыўнасць культуралагічнага падыходу да аналіза музея ўпершыню была абгрунтавана М. Каганам і знайшла працяг у работах Т. Калугінай, А. Масцяніцы, В. Сапанжы і інш.

У працэсе даследавання аўтар абапіраецца на прынцыпы гістарызму, аб'ектыўнасці і сістэмнасці, што дазваляе комплексна разгледзець станаўленне і дзейнасць беларускіх літаратурных музеяў. Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстаны комплекс метадаў як агульнанавуковых – аналіз, сінтэз, назіранне, класіфікацыя, аналогія, статыстычны і апытальны метады, так і спецыяльных. Пры вывучэнні колькасных паказчыкаў выкарыстоўваўся статыстычны метад, кантэнт-аналіз аказаўся карысным пры вывучэнні некаторых сучасных тэндэнцый у музейнай дзейнасці. У працэсе даследавання ўжываліся спецыяльныя гістарычныя метады: гісторыка-генетычны, параўнальна-гістарычны, гісторыка-тыпалагічны.

У параграфе **1.2 «Уплыў сацыякультурных працэсаў на станаўленне і развіццё літаратурных музеяў Беларусі»** на падставе сістэматызацыі і абагульнення значнай колькасці фактычнага матэрыялу вызначаны асноўныя этапы фарміравання сеткі літаратурных музеяў Беларусі.

У вывучаемым працэсе можна вылучыць чатыры асноўныя этапы (1920-я–пачатак 1940-х гг., 1940-я–1980-я гг., канец 1980-х–2001 г., 2002 г.–па цяперашні час), кожны з якіх мае адметнасці. Дынаміка развіцця сеткі літаратурных музеяў Беларусі на першых трох этапах дэманструе дастаткова стабільны рост: на першым этапе дзейнічала 2 музеі (адзін з якіх у хуткім часе быў рэарганізаваны), на другім – 4 музеі і 5 філіялаў, на трэцім – 7 музеяў і 12 філіялаў, на чацвёртым этапе назіраецца нязначны спад – 7 музеяў і 11 філіялаў.

Першы этап можна ахарактарызаваць як пачатак фарміравання сеткі літаратурных музеяў Беларусі. Ён мае выразную спецыфіку, таму што першыя спробы стварэння літаратурных музеяў былі здзейснены на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Значная роля ў гэтым працэсе належала ініцыятыве мясцовых жыхароў, якія імкнуліся ўшанаваць памяць знакамітых землякоў, а таксама дзейнасці навуковага таварыства «Міцкевічаўскі камітэт». «Піянерамі» ў станаўленні сеткі літаратурных музеяў можна назваць дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку і дом-музей Элізы Ажэшкі ў Гродне (рэарганізаваны). Гэтыя станоўчыя пачынанні не атрымалі развіцця, што тлумачылася палітычнымі ўмовамі, якія склаліся ў той перыяд у Заходняй Беларусі. Першыя літаратурныя музеі з'явіліся ў БССР пасля таго, як ужо была створана даволі разгалінаваная сетка музеяў іншых профіляў, а ў Расійскай Федэрацыі прадпрымаліся крокі па абагульненні вопыту дзейнасці музеяў менавіта літаратурнага профілю.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На другім этапе (1940-я–1980-я гг.) назіраецца рост колькасці музеяў літаратурнага профілю, якія ствараліся па ініцыятыве дзяржаўных органаў, што было вынікам палітыкі мемарыялізацыі агульнапрызнаных дзеячаў беларускай літаратуры. У гэты перыяд заснавана большая частка літаратурных музеяў Беларусі (Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, Літаратурны музей Петруся Броўкі, Літаратурны музей Максіма Багдановіча) і шэраг іх філіялаў. Адзначым, што назіраецца пэўная трансфармацыя форм, якія набывалі філіялы музеяў: ад літаратурна-мемарыяльных экспазіцый да музейна-сядзібных комплексаў і запаведнікаў. Лічым, што ў гэтым праяўляецца спецыфіка музеефікацыі літаратурных мясцін.

Пачатак трэцяга этапу (канец 1980-х–2001 г.) супадае са значнай падзеяй у беларускім літаратурным музеязнаўстве – заснаваннем у лістападзе 1987 г. Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры (адкрыты для наведвання ў 1991 г.), мэтай якога з'яўляецца дакументаванне нацыянальнага агульналітаратурнага працэсу. Адзначым, што такая схема развіцця сеткі літаратурных музеяў, якая склалася ў Беларусі, характэрна для многіх краін: першапачаткова ствараюцца музеі, прысвечаныя выдатным дзеячам нацыянальнай літаратуры, а затым – агульналітаратурны музей.

Выразнай адметнасцю трэцяга этапу з'яўляецца спроба цэнтралізацыі дзейнасці літаратурных музеяў шляхам стварэння Аб'яднання дзяржаўных літаратурных музеяў, якое дзейнічала з канца 1980-х гг. па 2001 г. Ва ўмовах сацыякультурнай дэструкцыі, якая назіралася ў беларускім грамадстве гэтага перыяду, стварэнне музейнага аб'яднання можна разглядаць як дзяржаўную нарматыўна-рэгулятыўную адаптацыю літаратурных музеяў да новых рэалій. Аб'яднанне мела сваю спецыфіку: у адрозненне ад расійскіх аналагічных утварэнняў у беларускім варыянце не прадугледжвалася стварэнне цэнтралізаваных фондаў у галаўным музеі. Музеі і іх філіялы ўваходзілі у Аб'яднанне як юрыдычныя асобы і суіснавалі на падставе дагавора аб сумеснай фінансавай і навуковай дзейнасці. З аднаго боку, музеі мелі пэўную самастойнасць у межах запланаваных субсідый, з другога – маглі разлічваць на дадатковае фінансаванне ў прыярытэтных выпадках (юбілейныя выставы, стварэнне стацыянарных экспазіцый і інш.). У гэты перыяд сетка літаратурных музеяў актыўна пашыралася за кошт стварэння філіялаў.

Чацвёрты этап (2002 г.–па цяперашні час) характарызуецца ўзмацненнем увагі да гісторыка-культурнай спадчыны на дзяржаўным узроўні праз фарміраванне заканадаўчай базы, якая забяспечвае эфектыўную музейную палітыку: прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» і шэраг іншых нарматыўных прававых актаў у галіне культуры. У гэты ж перыяд у літаратурных музеях актывізаваліся працэсы абнаўлення экспазіцый, правядзення капітальных рамонтаў музейных памяшканняў, узмацнення матэрыяльна-тэхнічнай базы музеяў. Адным са сродкаў адаптацыі да новых сацыякультурных умоў можна лічыць перападпарадкаванне некаторых філіялаў музеяў.

Такім чынам, за вывучаемы перыяд у Беларусі сфарміравалася развітая сетка літаратурных музеяў, якая аб'ядноўвае 7 музеяў і 11 філіялаў, валодаючых значным сацыякультурным патэнцыялам. Тэрытарыяльна большасць галаўных музеяў знаходзіцца ў Мінску, філіялы пераважна размяшчаюцца ў сельскай мясцовасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У параграфе **1.3 «Мадыфікацыя функцый літаратурнага музея як сацыякультурнага інстытута»** разглядаецца грамадскае прызначэнне музея, яго роля ў соцыуме.

Аўтарам аналізуюцца найбольш распаўсюджаныя канцэпцыі разумення музея (Й. Бенеш, З. Бонамі, У. Дукельскі, М. Каган, Т. Калугіна, Д. Камерон, З. Странскі і інш.), якія дэманструюць разнастайнасць поглядаў: ад вузкага разумення музея як спецыфічнай установы да разгляду музея як пэўнага сацыякультурнага інстытута, які адлюстроўвае развіццё культуры ў цэлым. На наш погляд, немэтазгодна разглядаць музей ізалявана ад іншых сацыякультурных устаноў і тым самым абмяжоўваць яго дзейнасць адным-двума кірункамі. Сучасны музей з'яўляецца, з аднаго боку, сацыякультурным інстытутам, які валодае спецыфічнымі ўнікальнымі магчымасцямі адлюстравання рэчаіснасці, з другога – падсістэмай культуры, і тыя працэсы, якія адбываюцца ў сацыякультурнай прасторы, аказваюць непасрэднае і прамое ўздзеянне на функцыянаванне музея.

Прапанавана аўтарскае вызначэнне літаратурнага музея з улікам яго спецыфічных асаблівасцей: *літаратурныя музеі* – гэта профільная група музеяў, якая дакументуе гісторыю літаратуры і з гэтай мэтай збірае, вывучае, захоўвае, экспануе і папулярызуе літаратурную спадчыну як частку гісторыка-культурнай спадчыны.

У рэалізацыі літаратурным музеем сацыяльных функцый можна вылучыць два ўзроўні. Першы фарміруюць традыцыйныя функцыі: дакументавання, адукацыі і выхавання, аксіялагічная, інтэрпрэтацыйная, камунікатыўная, рэкрэацыйная; другі ўзровень адлюстроўвае грамадскае прызначэнне музея, пад якім разумеецца забеспячэнне непарыўнасці працэсу трансляцыі культурных традыцый, пераўтварэнне музея ў месца міжкультурнага ўзаемадзеяння. Усе сацыяльныя функцыі музея цесна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой і адначасова падлягаюць уздзеянню сацыякультурных працэсаў, што развіваюцца ў грамадстве. Найбольш істотнымі знешнімі фактарамі, якія ўплываюць на дзейнасць музея, з'яўляюцца эканамічныя, палітычныя, сацыяльныя і духоўна-ідэалагічныя.

У параграфе **1.4 «Класіфікацыя літаратурных музеяў»** гэтая праблема разглядаецца з улікам пэўных арганізацыйных, прававых і змястоўных характарыстык, якія выбіраюцца адпаведна з пастаўленымі задачамі пры вывучэнні дзейнасці музеяў. На падставе агульнамузейнай класіфікацыі аўтарам праведзена класіфікацыя беларускіх літаратурных музеяў па наступных прыметах: профіль, арганізацыйны тып, спосаб рэалізацыі функцыі дакументавання (дамінантны тып каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў музеі), форма ўласнасці, прававы статус.

У межах профільнай класіфікацыі ў даследаванні вылучаюцца падгрупы літаратурных музеяў: гісторыка-літаратурныя (Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры), літаратурныя манаграфічныя (Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Літаратурны музей Максіма Багдановіча, Літаратурны музей Кузьмы Чорнага), літаратурныя персанальныя (філіял Літаратурнага музея Максіма Багдановіча «Беларуская хатка»), літаратурныя мемарыяльныя (Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, Літаратурны музей Петруся Броўкі, Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

большасць філіялаў), іншыя літаратурныя музеі, што дае магчымасць больш дэталёвага іх вывучэння.

Згодна з класіфікацыяй па арганізацыйных тыпах усе беларускія літаратурныя музеі адносяцца да навукова-асветніцкага тыпу. Па спосабе рэалізацыі функцыі дакументавання (па дамінантным тыпе каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў музеі) сярод беларускіх музеяў вылучаюцца як калекцыйныя, так  і ансамблевыя музеі (Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку і ўсе філіялы, якія з'яўляюцца музеямі-сядзібамі і запаведнікамі). Па форме ўласнасці ўсе літаратурныя музеі, разгледжаныя ў дысертацыі, з'яўляюцца дзяржаўнымі. Падзел па прававым статусе вызначае становішча музея ў іерархіі музейнай сеткі, яго правы і абавязкі. У гэтай катэгорыі беларускія літаратурныя музеі падзяляюцца на галаўныя музеі (літаратурныя музеі, якія знаходзяцца ў сталіцы) і філіялы.

Зазначым, што ў апошнія дзесяцігоддзі музейная структура стала больш рухомай, у выніку чаго змяняюцца і класіфікацыйныя прыметы. Выбар той ці іншай класіфікацыйнай схемы ў першую чаргу павінен падпарадкоўвацца задачам канкрэтнага даследавання. У некаторых выпадках патрабуецца выяўленне не толькі індывідуальных, але і агульных рысаў у дзейнасці музеяў.

У другім раздзеле дысертацыі **«Трансфармацыя асноўных кірункаў дзейнасці літаратурных музеяў Беларусі ў сучаснай сацыякультурнай прасторы»** аналізуюцца асноўныя напрамкі дзейнасці літаратурных музеяў, вызначаюцца тэндэнцыі і перспектывы іх развіцця.

У параграфе **2.1 «Навукова-даследчая дзейнасць літаратурнага музея як аснова яго функцыянавання»** адзначаецца, што без навукова-даследчай дзейнасці немагчыма належная рэалізацыя іншых напрамкаў музейнай работы.

Арганізацыя навукова-даследчай дзейнасці ў музеі мае сваю адметнасць. З аднаго боку, яна павінна суадносіцца з агульнымі кірункамі навуковага пошуку ў профільнай галіне і садзейнічаць яе развіццю. З другога – неабходна ўлічваць поліфункцыянальнасць музейнай дзейнасці і захоўваць яе спецыфіку.

Профільныя даследаванні ў літаратурных музеях Беларусі адкрываюць новыя крыніцы і ўводзяць іх у навуковы зварот, чым узбагачаюць распрацоўку праблематыкі літаратуразнаўства. На сучасным этапе назіраецца своеасаблівы падзел функцый паміж спецыялізаванымі навуковымі ўстановамі і літаратурнымі музеямі. Асноўны кірунак профільных даследаванняў літаратурных музеяў – збор эмпірычных даных, збіральніцтва і захаванне крыніц, дакументаў, іх першапачатковая апрацоўка і сістэматызацыя, абагульненне суадносна з ужо існуючымі ведамі і ўяўленнямі. Абапіраючыся на выпікі гэтай работы, профільныя навуковыя ўстановы праводзяць глабальныя абагульненні і ўводзяць новыя факты ў структуру ўстойлівых навуковых уяўленняў. Такім чынам, профільныя даследаванні, якія праводзяцца ў музеі, у тым ліку літаратурным, дазваляюць вызначыць месца ўсіх складнікаў музейнага збору ў сістэме профільнай навуковай дысцыпліны.

Музеязнаўчыя даследаванні з'яўляюцца агульнымі для ўсіх музеяў і звязаны з музеязнаўствам і памежнымі дысцыплінамі (распрацоўка навуковых канцэпцый музеяў, даследаванні ў галіне камплектавання і захавання фондаў, навуковае праектаванне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экспазіцый і інш.). Аднак, на наш погляд, спробы аналізу і навуковага абагульнення багатага вопыту літаратурных музеяў у галіне навукова-фондавай, экспазіцыйна-выставачнай, культурна-адукацыйнай дзейнасці не адпавядаюць маштабам музейнай практыкі.

Вынікі навукова-даследчай работы літаратурных музеяў атрымліваюць адлюстраванне як у традыцыйных, так і ў спецыфічных формах. Да традыцыйных выданняў адносяцца манаграфіі, зборнікі навуковых артыкулаў, справаздачы, навукова-папулярныя выданні і інш. Акрамя таго, для публікацыі сваіх даследаванняў музеі выкарыстоўваюць і такія віды выданняў, якія характэрны для вузкага кола ўстаноў: каталогі калекцый («Янка Купала ў выяўленчым мастацтве, 1882–2002», «Рукапісная спадчына Янкі Купалы»), тэматычныя каталогі («Пісьменнікі Беларусі – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны ў зборы ДМГБЛ»), дакументальныя публікацыі («Архіўныя матэрыялы да жыцця і творчасці Максіма Багдановіча»), даведнікі і інш. Спецыфічна музейнымі відамі публікацый з'яўляюцца экспазіцыі і выставы.

У параграфе **2.2 «Навукова-фондавая работа ў літаратурных музеях»** разглядаюцца асобныя аспекты навукова-фондавай работы музея, якія з'яўляюцца найбольш істотнымі для раскрыцця тэмы: навуковае камплектаванне фондаў, навуковая арганізацыя музейных фондаў і іх характэрныя рысы як сістэмы. Пытанні ўліку і навуковай дакументацыі фондаў, забеспячэння іх захаванасці не разглядаюцца, паколькі гэта вельмі значны пласт музейнай работы, які патрабуе асобнага даследавання.

Найбольш шырокая тэматыка камплектавання сярод беларускіх літаратурных музеяў выяўлена ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, паколькі гэта адзіны літаратурны музей, мэтай якога з'яўляецца адлюстраванне агульналітаратурнага працэсу. Згодна з перспектыўным планам камплектавання ў апошнія гады музей працуе па тэме «Літаратура XX стагоддзя», у рамках якой вылучаюцца больш вузкія тэмы адпаведна з сацыяльна-культурнымі праектамі, якія рэалізуюцца ў музеі. У выніку гэтай работы ў фонды паступілі матэрыялы з персанальных архіваў А. Вярцінскага, В. Зуёнка, У. Карызны, А. Петрашкевіча, П. Пранузы, П. Прыходзькі, А. Савіцкага, В. Тараса, І. Чыгрынава, І. Шамякіна і інш.

Музеі, прысвечаныя адной асобе, камплектуюць свае фонды пераважна матэрыяламі аб яе жыцці і творчасці, а таксама падзеях, з'явах і працэсах, да якіх пісьменнік меў дачыненне.

Важным аспектам пры камплектаванні музейных фондаў з'яўляецца выяўленне музейнай каштоўнасці прадмета, якая вызначаецца на аснове яго навуковай, гістарычнай, мастацкай і мемарыяльнай каштоўнасці і дэманструе яго значнасць для выкарыстання ў музеі. На наш погляд, для музеяў літаратурнага профілю мэтазгодна вылучаць і такі крытэрый, як *літаратурная каштоўнасць.* Мы разумеем літаратурную каштоўнасць як значнасць прадмета ў якасці літаратурнага помніка, якая характарызуецца яго сувязямі з гісторыка-літаратурнымі падзеямі і з'явамі, а таксама роляй у сацыякультурным жыцці пэўнага перыяду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Можна вылучыць асноўныя групы матэрыялаў, якія падлягаюць камплектаванню ў літаратурных музеях: мемарыяльныя і асабістыя рэчы; рукапісы; дакументы; кнігі і часопісы; выяўленчыя матэрыялы; друкаваны тэкст; кіна- , фота- і фонаматэрыялы.

Беларускімі літаратурнымі музеямі выкарыстоўваюцца разнастайныя формы і метады камплектавання. Разам з традыцыйнымі формамі прымяняюцца такія спецыфічныя, як тэматычнае анкетаванне, збор успамінаў людзей з акружэння пісьменніка. Пазітыўным момантам з'яўляецца вывучэнне і адлюстраванне ў музейных фондах сучасных літаратурных працэсаў.

Параграф **2.3 «Прэзентацыя гісторыка-культурнай і літаратурнай спадчыны ў музеях літаратурнага профілю»** раскрывае асноўныя формы прэзентацыі літаратурнай і гісторыка-культурнай спадчыны ў літаратурных музеях, якімі з'яўляюцца экспазіцыі і выставы. Адзначым, што фондавыя і справаздачныя выставы літаратурнымі музеямі ствараюцца даволі рэдка, гэтую нішу запаўняюць юбілейныя. Такім чынам, можна вылучыць два асноўныя тыпы выстаў у літаратурным музеі: тэматычныя, за аснову якіх бярэцца пэўны сюжэт («Хата – мой сусвет», «Ад А да Я – з гісторыі буквара», «Спадарожнікі дзяцінства» і інш.) і юбілейныя, прысвечаныя знамянальнай літаратурнай даце ці падзеі («Вандроўнік вакол свету» да 120-годдзя з дня нараджэння Янкі Маўра, «Брама неўміручасці» да 110-годдзя з дня нараджэння Кандрата Крапівы, «Трывожнае шчасце пісьменніка» да 85-годдзя з дня нараджэння Івана Шамякіна, «Планета "Вясёлка"» да юбілею часопіса і інш.).

Пераважная большасць літаратурных выстаў і экспазіцый створана пры дапамозе тэматыка-храналагічнага, ансамблевага, а таксама комплекснага метадаў. Пры стварэнні экспазіцый на сучасным этапе пераважаюць традыцыйныя метады, аднак выставы становяцца больш дэмакратычнымі, заснаванымі на прынцыпах інтэрактыўнасці і дыялагічнасці. У навукова-экспазіцыйнай дзейнасці сучасных літаратурных музеяў суіснуюць дзве асноўныя тэндэнцыі: манаграфічнае адлюстраванне жыцця і творчасці пісьменнікаў дапаўняецца больш шырокім паказам гісторыка-літаратурных працэсаў праз увядзенне ў экспазіцыю элементаў гістарычнага, этнаграфічнага, мастацкага, краязнаўчага характару і арыентацыю на адлюстраванне такога аспекту, як «пісьменнік і пэўная мясцовасць» пры акцэнце на мясцовы матэрыял. Прыкладам можа служыць арганізацыя экспазіцыйнай прасторы рэгіянальных філіялаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.

Адметнасць і складанасць стварэння літаратурнай экспазіцыі праяўляецца і ў тым, што часам не дастаткова адлюстравання ў экспазіцыі менавіта літаратурнай творчасці пісьменніка, паколькі літаратурныя дзеячы, часцей за ўсё, з'яўляюцца таленавітымі і ў іншых творчых сферах, такіх як мастацкая, тэатральная, рэжысёрская і інш., а таксама займаюць актыўную грамадска-палітычную пазіцыю. Музейныя супрацоўнікі ўлічваюць асаблівасць міжасобасных і міжгрупавых узаемаадносін, пэўнае кола кантактаў творчых людзей, куды звычайна ўваходзяць знакамітыя постаці той ці іншай эпохі, узаемаадносіны з якімі таксама неабходна адлюстроўваць у экспазіцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У літаратурнай экспазіцыі ў адпаведнасці з задачамі, якія ставяцца пры яе стварэнні, можа быць адлюстравана гістарычная эпоха; біяграфія пісьменніка; яго грамадская дзейнасць; рэчаіснасць, якая паслужыла матэрыялам для творчасці пісьменніка; змест і ідэйны сэнс твора; некаторыя пытанні творчай лабараторыі пісьменніка (праца над рукапісам і г.д.); значнасць творчасці пісьменніка для яго сучаснікаў і наступных пакаленняў.

Параграф **2.4 «Культурна-камунікатыўная спецыфіка літаратурнага музея».** Камунікатыўныя працэсы, характэрныя для сучасных літаратурных музеяў, вельмі шматгранныя і ўключаюць як працэсы спецыфічна-музейнай апрацоўкі інфармацыі, што рэалізуецца ў асобных напрамках музейнай дзейнасці (фондавая, экспазіцыйная, культурна-адукацыйная і г.д.), так і працэсы, якія дазваляюць уключыць музейную камунікацыю ў агульнакультурныя камунікатыўныя працэсы, звязаныя з захаваннем і інтэрпрэтацыяй гісторыка-культурнай і літаратурнай спадчыны.

Асноўная мэта музейнай камунікацыі – гэта перадача музейнай інфармацыі і яе эфектыўнае засваенне наведвальнікамі. Успрыманне музейнай інфармацыі можна разглядаць як спалучэнне наступных стадый: дакамунікатыўнай, камунікатыўнай і посткамунікатыўнай.

Першая з іх уключае міжасобасныя, міждысцыплінарныя кантакты, СМІ, рэкламу. Складнікамі камунікатыўнай стадыі ў межах экспазіцыі з'яўляюцца музейныя прадметы, навукова-дапаможныя матэрыялы, сістэма арыентацыі, музейныя супрацоўнікі; па-за экспазіцыяй – музейныя мерапрыемствы, друкаваная прадукцыя, архітэктура будынка, сувенірная крама і інш. Усё гэта складае імідж музея і ўплывае на посткамунікатыўную стадыю – прыняцце чалавекам рашэння аб наведванні (ці ненаведванні) музея яшчэ раз.

Адзначым, што для літаратурных музеяў характэрна актыўнае камунікатыўнае ўзаемадзеянне паміж наведвальнікамі і творчымі дзеячамі падчас правядзення літаратурных вечароў, прэзентацый кніг і выстаў. Прыкладам могуць служыць «літаратурныя чацвяргі» і сустрэчы маладых пісьменнікаў і музыкантаў «Кватэрнікі ў дзядзькі Якуба» ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа.

Ва ўмовах, калі рынак сацыяльна-камунікатыўных паслуг прапануе разнастайныя тэхнічныя сродкі і тэлекамунікатыўныя тэхналогіі, найноўшай формай становіцца электронная інфармацыйная прастора. Камп'ютар як сродак для атрымання дадатковай інфармацыі аб музеі і яго калекцыях, віртуальныя музеі, інтэрнэт-старонкі – гэтыя камунікатыўныя каналы ўжо сёння запатрабаваныя музейнымі наведвальнікамі. У апошні час у развіцці гэтага працэса назіраецца станоўчая дынаміка: усімі літаратурнымі музеямі створаны ўласныя сайты, акрамя Літаратурнага музея Петруся Броўкі, які мае старонку на партале «Музеі Беларусі».

У параграфе **2.5 «Асаблівасці культурна-адукацыйнай дзейнасці літаратурных музеяў Беларусі»** даследуецца адзін з асноўных музейных кірункаў, праз які рэалізуецца адна з важнейшых функцый музея – адукацыі і выхавання. У параграфе аналізуюцца традыцыйныя і новыя формы і метады работы літаратурных музеяў, іх уздзеянне на музейную аўдыторыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У апошнія дзесяцігоддзі ў культурна-адукацыйнай дзейнасці літаратурных музеяў на аснове камунікатыўнага падыходу адбываюцца значныя змены ў адносінах «наведвальнік – музей». Калі раней наведвальнік разглядаўся як аб’ект уздзеяння, то згодна з сучаснымі прыярытэтамі ён успрымаецца як раўнапраўны субяседнік, носьбіт пэўных культурных установак, які мае ўласныя інтарэсы і права на самастойны адбор інфармацыі, надаецца вялікая ўвага яго духоўна-эмацыянальнай сферы, яго запатрабаванням.

Вынікам змены культурна-адукацыйных прыярытэтаў музея стала пашырэнне форм працы – ад спецыфічных музейных да нетрадыцыйных для музея. Хаця па-ранейшаму дамінуюць традыцыйныя формы, напрыклад, экскурсія, пашыраюцца і сучасныя формы работы, такія як музейна-педагагічныя заняткі, інтэрактыўныя гульні, клубы, студыі ў музеі і інш. Стварэнне інтэрактыўных экспазіцый, распрацоўка прагрэсіўных музейна-педагагічных методык спрыяюць пераадоленню пасіўных форм успрыняцця музейнай інфармацыі. Асноўнай аўдыторыяй музеяў літаратурнага профілю застаюцца дзеці ўсіх узростаў, навучэнцы і студэнты. Сярод экспазіцыйных і культурна-адукацыйных праектаў сталі з’яўляцца мэтавыя, арыентаваныя на пэўную сацыяльную і ўзроставую катэгорыю (часцей за ўсё разлічаныя на дзіцячую аўдыторыю), напрыклад, выставы «Ад А да Я – з гісторыі буквара», «Планета “Вясёлка”», «Спадарожнікі дзяцінства» ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, «Мой мілы таварыш, мой лётчык…» у Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы і інш. Музеямі ўсведамляецца неабходнасць пашырэння рэальнай аўдыторыі за кошт індывідуальнага і сямейнага наведвальніка, распрацоўваюцца спецыяльныя праекты, разлічаныя на гэту катэгорыю («Пяць музеяў за пяць тыдняў»).

У параграфе **2.6 «Тэндэнцыі і перспектывы развіцця літаратурных музеяў Беларусі ў кантэксце сучасных сацыякультурных працэсаў»** на падставе даследавання тэарэтычных распрацовак, анкетавання музейных супрацоўнікаў і аналізу практычнага вопыту аўтарам вылучаюцца тэндэнцыі і перспектывы далейшага развіцця літаратурных музеяў.

Можна вылучыць два кірункі рэалізацыі музейных функцый: традыцыйны і сучасны – і гаварыць пра магчымасць іх узаемадзеяння. Такая тэндэнцыя выразна праяўляецца ў тым, што традыцыйна ўласцівыя музею функцыі становяцца асновай для рэалізацыі інавацыйных праграм, якія актуальны для сучаснага этапу развіцця музейнай справы.

Застаючыся цэнтрамі захавання гісторыка-культурнай і літаратурнай спадчыны, у сучасных сацыякультурных умовах літаратурныя музеі Беларусі пераўтвараюцца ў адкрытую сістэму, якая арыентавана на задавальненне запатрабаванняў «спажыўца», дзеля чаго музей павінен стаць канкурэнтаздольным у розных сферах дзейнасці: сацыякультурнай, навукова-інфармацыйнай, адукацыйнай, рэкрэацыйнай.

Лічым перспектыўным пашырэнне задач адукацыйна-выхаваўчай функцыі музея, таму што перадача культурнага вопыту стане больш прыярытэтнай, чым проста перадача ведаў. Да гэтага працэсу далучаецца арыентацыя музея на ўдзел у арганізацыі вольнага часу насельніцтва праз выставы, музейныя мерапрыемствы, якія спалучаюць адукацыйны,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

забаўляльны і відовішчны кампаненты, укараненне новых форм працы з аўдыторыяй, пошукі ў галіне музейнай камунікацыі. Перспектыўным кірункам у развіцці культурна-адукацыйнай дзейнасці літаратурнага музея таксама з'яўляецца далучэнне да музейнай аўдыторыі людзей з абмежаванымі магчымасцямі: стварэнне спецыялізаваных выстаў і адукацыйных праграм.

У экспазіцыйнай дзейнасці назіраецца станоўчая тэндэнцыя павелічэння колькасці адрасных выстаў, створаных для пэўнай катэгорыі музейнай аўдыторыі з улікам яе псіхалагічных і сацыялагічных характарыстык. Вынікам развіцця дзіцячага кірунку ў экспазіцыйнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці можа стаць стварэнне Дзіцячага літаратурнага музея.

Канстатуючы актыўнае развіццё электроннай інфармацыйнай прасторы, можна адзначыць больш эфектыўнае выкарыстанне музеямі ўсіх каналаў перадачы інфармацыі. Ад першых спроб стварэння інтэрнэт-старонак і сайтаў – да шырокага выкарыстання дадзенага камунікатыўнага канала (3D-тэхналогіі ў экспазіцыі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы).

Такім чынам, перспектыўнае развіццё літаратурных музеяў Беларусі будзе адбывацца праз пашырэнне сферы музейных паслуг, разнастайнасці іх зместу і павышэнне іх якаснага ўзроўню.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

1. У станаўленні і развіцці сеткі літаратурных музеяў Беларусі выразна праяўляюцца наступныя этапы: 1920-я – пачатак 1940-х гг. – першыя спробы стварэння літаратурных музеяў па ініцыятыве грамадскіх аб'яднанняў з мэтай ушанавання памяці славутых землякоў; 1940-я – 1980-я гг. – развіццё сеткі літаратурных музеяў у русле дзяржаўнай палітыкі мемарыялізацыі найбольш вядомых дзеячаў беларускай літаратуры; канец 1980-х – 2001 г. – дзейнасць літаратурных музеяў у рамках Аб'яднання дзяржаўных літаратурных музеяў; 2002 г. – па цяперашні час – пошук шляхоў мадэрнізацыі ў новых сацыякультурных умовах. Усе этапы цесна звязаны з працэсамі, што адбываліся ў палітычным, эканамічным, сацыякультурным жыцці грамадства. У развіцці сеткі беларускіх літаратурных музеяў на першых трох этапах прасочваецца ўстойлівая станоўчая дынаміка: 1-ы этап – 2 музеі (адзін рэарганізаваны); 2-і этап – 4 музеі і 5 філіялаў; 3-і этап – 7 музеяў і 12 філіялаў; для чацвёртага этапа характэрна нязначнае змяншэнне колькасці музеяў – 7 музеяў і 11 філіялаў. Стварэнне разгалінаванай сеткі рэгіянальных філіялаў можна лічыць адметнасцю літаратурных музеяў, прычым назіраецца пэўная трансфармацыя форм, якую яны набываюць: ад літаратурна-мемарыяльных экспазіцый да музейна-сядзібных комплексаў і запаведнікаў. У гэтым праяўляецца спецыфіка музеефікацыі літаратурных мясцін. Сетка літаратурных музеяў, якая склалася ў Беларусі, уключае музей нацыянальнай літаратуры (Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры) і шэраг музеяў, якія прысвечаны жыццю і творчасці асобных літаратурных дзеячаў [9; 10; 11].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Спецыфіка літаратурных музеяў праяўляецца ў дакументаванні і прэзентацыі творчасці таго ці іншага літаратара або літаратурнага працэсу наогул у непарыўнай сувязі з сацыякультурнымі каштоўнасцямі пэўнага гістарычнага перыяду. Такім чынам сацыяльны кантэкст уступае ва ўзаемадзеянне з літаратурным. Узаемаадносіны літаратурнага музея і грамадства не абмяжоўваюцца пасіўным адлюстраваннем рэчаіснасці, адбываецца і актыўнае ўздзеянне на яе з боку музея: літаратурны музей спрыяе развіццю навукі і культуры, фарміраванню культурнага асяроддзя, разуменню літаратурнай і гісторыка-культурнай спадчыны. У працэсе камплектавання фондаў беларускімі літаратурнымі музеямі разам з традыцыйнымі формамі прымяняюцца такія спецыфічныя, як тэматычнае анкетаванне, збор успамінаў людзей з акружэння пісьменніка. Акрамя агульнапрынятых крытэрыяў адбору музейных прадметаў вылучаецца і такі як літаратурная каштоўнасць.

На падставе ўліку спецыфічных асаблівасцей прапанавана наступнае *вызначэнне літаратурнага музея*: літаратурныя музеі – гэта профільная група музеяў, якая дакументуе гісторыю літаратуры і з гэтай мэтай збірае, вывучае, захоўвае, экспануе і папулярызуе літаратурную спадчыну як частку гісторыка-культурнай спадчыны.

У межах профільнай класіфікацыі беларускія літаратурныя музеі можна падзяліць на падгрупы (гісторыка-літаратурныя, літаратурныя манаграфічныя, літаратурныя персанальныя, літаратурныя мемарыяльныя, іншыя літаратурныя музеі), што дае магчымасць больш дэталёвага іх вывучэння [1; 3; 5].

3. Дзейнасць літаратурных музеяў мае поліфункцыянальны характар, які праяўляецца ў двух узроўнях рэалізацыі сацыяльных функцый. Першы ўключае асноўныя кірункі дзейнасці, якія ажыццяўляюцца праз рэалізацыю традыцыйных сацыяльных функцый: дакументаванне, адукацыйна-выхаваўчая, аксіялагічная, інтэрпрэтацыйная, камунікатыўная, рэкрэацыйная. Другі ўзровень – грамадскае прызначэнне музея, пад якім разумеюцца ўдзел у працэсе непарыўнага развіцця культуры, задачы забеспячэння бесперапыннасці трансляцыі культурных традыцый і пераўтварэнне музея ў месца міжкультурнага ўзаемадзеяння. Адлюстроўваючы змены, што адбываюцца ў грамадстве, літаратурныя музеі таксама трансфармуюцца ў бок актуалізацыі камунікатыўнага аспекта і надання прыярытэтаў новым формам і метадам працы. У сучасных умовах музейная дзейнасць набывае ўсё большае сацыякультурнае значэнне, узрастае роля музеяў у захаванні і інтэрпрэтацыі літаратурнай і гісторыка-культурнай спадчыны, у культурна-адукацыйным працэсе, арганізацыі вольнага часу [1; 7].

4. Экспазіцыйна-выставачная дзейнасць літаратурных музеяў развіваецца ў рэчышчы сусветных тэндэнцый. Тым не менш назіраецца пэўная спецыфіка ў падыходах да прэзентацыі літаратурнай і гісторыка-культурнай спадчыны. Літаратурныя музеі Беларусі прадстаўляюць сваім наведвальнікам як стацыянарныя экспазіцыі, так і часовыя выставы. Мэта стацыянарнай экспазіцыі – усебаковае адлюстраванне жыцця і творчасці пісьменніка, асобнага перыяду яго дзейнасці ці пэўнага гісторыка-літаратурнага перыяду. Часовыя выставы звычайна ствараюцца літаратурнымі музеямі да знамянальнай даты ці падзеі або асвятляюць пэўную літаратурную тэму. Невялікі працэнт у літаратурных музеях складаюць фондавыя і справаздачныя выставы. Такім чынам, два асноўныя тыпы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выстаў у літаратурным музеі – тэматычныя і юбілейныя. Для стварэння экспазіцый і выстаў у літаратурных музеях пераважна выкарыстоўваюцца тэматыка-храналагічны, ансамблевы і комплексны метады. Сістэматычны (калекцыйны) метад пабудовы экспазіцый амаль не выкарыстоўваецца, адной з прычын чаго з'яўляецца плоскасны характар экспазіцыйнага матэрыялу [3; 5; 6].

5. Літаратурныя музеі Беларусі перажываюць перыяд пераасэнсавання сваёй ролі і месца ў грамадстве, што абумоўлівае новыя падыходы ў рашэнні задач, якія ўзнікаюць перад імі ў сучасных сацыякультурных умовах. Асноўнымі тэндэнцыямі з'яўляюцца змены ў розных напрамках музейнай дзейнасці, асабліва ў культурна-адукацыйным кірунку, вынікам чаго стала спалучэнне спецыфічна музейных і нетрадыцыйных для музея форм працы (інтэрактыўныя гульні, тэатральна-відовішчныя элементы). Актывізавалася дзейнасць літаратурных музеяў у сферы арганізацыі вольнага часу, якая вызначаецца тэматычнай накіраванасцю згодна з профілем музея. У працы з наведвальнікам вылучаецца тэндэнцыя стварэння адрасных праектаў, разлічаных на розныя катэгорыі. Экспазіцыйная дзейнасць літаратурных музеяў становіцца больш разнастайнай, існуюць спробы стварэння дыферэнцыраваных выстаў.

У апошнія дзесяцігоддзі адбыўся паварот ад манаграфічнага паказу жыцця і творчасці пісьменніка да больш шырокага адлюстравання гісторыка-літаратурнага працэсу наогул. Акцэнты ставяцца на выяўленне сувязей літаратуры з эпохай, шырэй адлюстроўваецца рэчаіснасць, якая паўплывала на творчасць пісьменнікаў. Яшчэ адна тэндэнцыя – павелічэнне колькасці экспазіцый, прысвечаных жыццю і творчасці пісьменніка ў пэўнай мясцовасці. Гэта найбольш характэрна для рэгіянальных філіялаў літаратурных музеяў. Калі раней існавала тэндэнцыя ў поўным аб'ёме расказаць пра пісьменніка, яго творы, то зараз увага засяроджваецца на якім-небудзь адным, найбольш значным для канкрэтнага музея ракурсе, вылучаецца вядучая лінія, якая вызначаецца фондавымі зборамі, рэальнымі запатрабаваннямі музея і рэгіёна, у якім ён знаходзіцца.

Шырокае развіццё інфармацыйных тэхналогій, характэрнае для сучаснага грамадства, паўплывала і на змены ў музейнай дзейнасці. Пашыраецца выкарыстанне музеямі ўсіх каналаў перадачы інфармацыі, у тым ліку электроннай інфармацыйнай прасторы. На новы ўзровень выходзіць апрацоўка музейных прадметаў: вядзенне ўнутрымузейных электронных баз даных і прынятце рашэння аб стварэнні Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь як агульнадзяржаўнай электроннай базы даных, што ў перспектыве павялічыць даступнасць фондаў літаратурных музеяў [1; 2; 4; 7; 8].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Вынікі даследавання знайшлі практычнае выкарыстанне ў вучэбным працэсе установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 01.11.2012 г.).

Асобныя вынікі даследавання знайшлі практычнае ўвасабленне ў дзейнасці Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Аўтарам распрацаваны музейна-педагагічныя заняткі «Як хлеб да нас на стол прыйшоў» (акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 30.06.2003 г.), «Як жылося буквару ў розныя часы» (у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суаўтарстве з В. Атрошчанкай, В. Гулевай; акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 20.09.2003 г.), «Фэсцік. Гулянне ў народным стылі» (у суаўтарстве з В. Атрошчанкай; акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 20.06.2006 г.), лекцыя «Беларуская міфалогія» (акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 10.11.2003 г.), створаны выставы «Ад А да Я – з гісторыі буквара» (навуковая канцэпцыя ў суаўтарстве з В. Чурылай, мастак Г. Чысты; акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 15.01.2006 г.), «Хата – мой сусвет» (навуковая канцэпцыя ў суаўтарстве з В. Гулевай, мастак Г. Чысты; акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 04.04.2006 г.), перасоўная выстава-плакат «Быў. Ёсць. Буду» да 75-годдзя з дня нараджэння У. Караткевіча (дызайнер М. Чысты; акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 14.06.2005 г.), «Трывожнае шчасце пісьменніка» (мастак Г. Чысты; акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 16.02.2006 г.), «Планета "Вясёлка"» (навуковая канцэпцыя ў суаўтарстве з В. Атрошчанкай, мастак Г. Чысты; акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 11.08.2006 г.).

Матэрыялы даследавання могуць ужывацца пры падрыхтоўцы вучэбных курсаў «Уводзіны ў спецыяльнасць», «Музеі Беларусі», «Гісторыя музейнай справы», «Праектаванне музейных экспазіцый», «Тэорыя і методыка музейнай справы», «Музейная педагогіка» і шэрагу спецкурсаў для студэнтаў музейнай і іншых гуманітарных спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў. Аўтарам падрыхтаваны вучэбныя праграмы па дысцыплінах «Тэорыя і практыка экскурсійнай работы», «Маркетынг музейнай справы», «Музейная рэклама».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы ў навуковых рэцэнзаваных часопісах

1. Лупашка, І.Г. Сацыяльныя функцыі літаратурнага музея / І.Г. Лупашка // Вестн. Молодеж. науч. о-ва. – 2003. – Спец. вып. : Культура Беларуси в XXI веке. – С. 27–28.
2. Лупашка, І.Г. Музей і школа: шляхі ўзаемадзеяння / І.Г. Лупашка // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 12. – С. 69–74.
3. Лупашка, І.Г. Матэрыялы перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў фондах Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры / І.Г. Лупашка // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. –2005. – № 4. – С. 114–119.
4. Лупашка, І.Г. Асноўныя тэндэнцыі культурна-адукацыйнай дзейнасці беларускіх літаратурных музеяў на сучасным этапе / І.Г. Лупашка // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2011. – № 1. – С. 154–160.

### Матэрыялы навуковых канферэнцый

5. Лупашка, І.Г. Спецыфіка адлюстравання рэчаіснасці ў музеях літаратурнага профілю / І.Г. Лупашка // VIII Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў, Мінск, 23–26 мая 2002 г / Беларус. дзярж. ун-т культуры ; рэдкал.: М.А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2003. – С. 113–117.
6. Лупашка, І.Г. Кніга ў літаратурным музеі : уласцівасці і функцыі кнігі як музейнага прадмета / І.Г. Лупашка // Матэрыялы Трэціх Міжнародных Кнігазнаўчых чытанняў «Кніга Беларусі: повязь часоў», Мінск, 16–17 верас. 2003 г. / Нац. б-ка Беларусі ; рэдкал.: Л.Г. Кірухіна (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск, 2005. – С. 262–266.
7. Лупашка, І.Г. Камунікатыўная роля музея як захавальніка духоўнай спадчыны / І.Г. Лупашка // XIII Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў, Мінск, 24–26 мая 2007 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М.А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – С. 93–102.
8. Лупашка, І.Г. Музейна-педагагічныя заняткі як адна з форм культурна-адукацыйнай дзейнасці беларускіх літаратурных музеяў: у ракурсе сусветных тэндэнцый / І.Г. Лупашка // Культура Беларусі і сусвет: агульнае і асаблівае : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 13–14 лістап. 2008 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: Н.А. Ляйко (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 131–135.
9. Лупашка, І.Г. Рэгіянальныя музеі як культурныя і турыстычныя цэнтры: на прыкладзе рэгіянальных філіялаў літаратурных музеяў / І.Г. Лупашка // Чацвёртыя Тышкевіцкія чытанні : матэрыялы чытанняў, Валожын, 24 кастр. 2012 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М.А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 52–59.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Дэпаніраваныя артыкулы

10. Лупашка, І.Г. Станаўленне першых літаратурных музеяў у Беларусі і Расіі: параўнаўчы аналіз / І.Г. Лупашка // Нацыянальная спадчына і сучасныя праблемы культуры, прысвячаная 60-годдзю вызвалення Беларусі : даклады, прачыт. на XXIX канф. студэнтаў і аспірантаў Беларус. дзярж. ун-та культуры, Мінск, 22–23 крас. 2004 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры ; рэдкал.: М.А. Бяспалая (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2004. – 5 с. – Дэп. у БелІСА 30.06.2004, № Д200469. – С. 175.

11. Лупашка, І.Г. Вызначэнне паняцця «мемарыяльнасць» у адносінах да літаратурнага музея / І.Г. Лупашка // Каштоўнасці нацыянальнай культуры і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне студэнцкай моладзі, прысвечаныя 60-годдзю Перамогі : дакл., прачыт. на XXX канф. аспірантаў Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў, Мінск, 20–21 крас. 2005 г. / рэдкал.: М.А. Бяспалая (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск , 2005. –5 с. –Дэп. у ДУ «Бел ІСА» 04.01.2007, № Д20073. – С. 141.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЭЗЮМЭ


**Лупашка Ірына Генадзьеўна**

**Функцыянаванне беларускіх літаратурных музеяў у кантэксце сучасных сацыякультурных працэсаў**

Ключавыя словы: літаратурны музей, сацыякультурны інстытут, класіфікацыя музеяў, музеефікацыя літаратурнай спадчыны, віды музейнай дзейнасці.

Мэта даследавання: выявіць асноўныя заканамернасці, спецыфіку і тэндэнцыі развіцця літаратурных музеяў Беларусі ў кантэксце сацыякультурных працэсаў.

Метады даследавання. Метадалагічная база даследавання грунтуецца на культуралагічным падыходзе да феномена музея. Для раскрыцця тэмы даследавання прааналізаваны і выкарыстаны канцэптуальныя палажэнні тэорый музейнай камунікацыі, навуковага дакументавання, тэзаўравання, пабудовы экспазіцый і інш. Выкарыстаны комплекс метадаў, сярод якіх як агульнанавуковыя (тэарэтычныя і эмпірычныя), так і спецыяльныя: гісторыка-генетычны, параўнальна-гістарычны, гісторыка-тыпалагічны, статыстычны, кантэнт-аналізу.

Атрыманыя вынікі і іх навізна. У дадзенай дысертацыі ўпершыню абагулены вопыт развіцця беларускіх літаратурных музеяў у кантэксце сацыякультурных працэсаў і вылучаны асноўныя этапы фарміравання сеткі літаратурных музеяў Беларусі. Адлюстравана поліфункцыянальная дзейнасць беларускіх літаратурных музеяў, іх роля як сацыякультурных інстытутаў. Прапанавана аўтарскае вызначэнне літаратурнага музея і класіфікацыя літаратурных музеяў па класіфікацыйных прыкметах. Вылучаны тэндэнцыі развіцця літаратурных музеяў Беларусі.

Рэкамендацыі па выкарыстанні. Матэрыялы даследавання могуць стаць карыснымі для стварэння вучэбных курсаў «Уводзіны ў спецыяльнасць», «Музеі Беларусі», «Праектаванне музейных экспазіцый», «Тэорыя і методыка музейнай справы», «Музейная педагогіка» і шэрагу спецкурсаў для студэнтаў музейнай і іншых гуманітарных спецыяльнасцей. Фактычны матэрыял работы можа стаць асновай для далейшых даследаванняў, стварэння абагульняючых работ па тэорыі і гісторыі музеязнаўства.

Галіна выкарыстання: музеязнаўства, культуралогія, гісторыя Беларусі, педагогіка.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЕЗЮМЕ

**Лупашко Ирина Геннадьевна**

**Функционирование белорусских литературных музеев в контексте современных социокультурных процессов**

Ключевые слова: литературный музей, социокультурный институт, классификация музеев, музеефикация литературного наследия, виды музейной деятельности.

Цель исследования: выявить основные закономерности, специфику и тенденции развития литературных музеев Беларуси в контексте социокультурных процессов.

Методы исследования. Методологическая база исследования основывается на культурологическом подходе к феномену музея. Для раскрытия темы исследования проанализированы и использованы концептуальные положения теорий музейной коммуникации, научного документирования, тезаврирования, построения экспозиций и др. Использован комплекс методов, среди которых как общенаучные (теоретические и эмпирические), так и специальные: историко-генетический, сравнительно-исторический, историко-типологический, статистический, контент-анализа.

Полученные результаты и их новизна. В данной диссертации впервые обобщен опыт развития белорусских литературных музеев в контексте социокультурных процессов и выделены основные этапы формирования сети литературных музеев Беларуси. Отображена полифункциональная деятельность белорусских литературных музеев, их роль как социокультурных институтов. Предложено авторское определение литературного музея и классификация литературных музеев по нескольким классификационным признакам. Обозначены тенденции развития литературных музеев Беларуси.

Рекомендации по использованию. Материалы исследования могут оказаться полезными для создания учебных курсов «Введение в специальность», «Музеи Беларуси», «Проектирование музейных экспозиций», «Теория и методика музейного дела», «Музейная педагогика» и ряда спецкурсов для студентов музейной и других гуманитарных специальностей. Фактический материал работы может стать основой для дальнейших исследований, создания обобщающих работ по теории и истории музееведения.

Область применения: музееведение, культурология, история Беларуси, педагогика.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## SUMMARY

**Iryna Lupashko**

**Belarusian Literary Museums in the Modern Socio-Cultural Environment**

Key Words: literary museum; socio-cultural institution; museum classification; storing literary legacy in museums; types of museum activities.

Thesis Objective: to depict major patterns, specifics and trends in the evolvement of literary museums in Belarus in the socio-cultural context.

Research Methods. Research methodology is based on the approach used in the sphere of cultural studies to describe the phenomenon of museum. In order to undertake full-scale research on the thesis topic, concepts of theories on museum communication, scientific documentation, thesaurusing (storage and cataloguing), designing exhibitions, etc have been analyzed and applied. Also a whole range of methods was utilized including both general research methods (theoretical and empiric) and special methods – historical genetic, comparative historical and historical typological methods as well as the methods of statistics and content analysis.

Acquired Results and Their Novelty. The present PhD thesis provides a first-ever generalization of the Belarusian literary museums' evolvement in the socio-cultural environment. The author singles out major stages of development of the literary museums' network in Belarus; describes multifunctional activities performed by the Belarusian literary museums and their role as socio-cultural institutions; offers her definition of the literary museum and classifies literary museums by several characteristics. Trends of further development of literary museums in Belarus have also been pointed out in the thesis.

Application Guidelines. The present research outcomes can be used in development of such study courses as follows: «Introduction to Museum Studies»; «Belarus' Museums»; «Engineering Museum Exhibitions»; «Theory and Practice of Museum Work »; «Teaching the Art of Museums» and a range of extra-curricula courses for students majoring in Museum Studies and Humanities. The thesis materials can lay the groundwork for further research and surveys on theory and practice of museum work.

Range of Application: Museum Studies, Cultural Studies, History of Belarus, Pedagogy.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковае выданне

**Лупашка Ірына Генадзьеўна**

**Функцыянаванне беларускіх літаратурных музеяў у кантэксце сучасных сацыякультурных працэсаў**

**Аўтарэферат**

дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі

Падпісана ў друк 22.04.2013. Фармат 60x84$^1/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,67. Ул.-выд. арк. 1,56. Тыраж 60 экз. Заказ 101.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ